# Гісторыя

*А.А. ЛЮБАЯ*

## СТАНОВІШЧА ТАТАР-ІМІГРАНТАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў КАНЦЫ XV – ПЕРШАЙ ТРЭЦІ XVI ст.

Рассматриваются некоторые категории татар-иммигрантов, которые прибыли в Великое княжество Литовское в конце XV – первой трети XVI в. Делается вывод о существовании комплекса причин, приведших татар на земли великого князя, что способствовало интенсификации процесса формирования татарской общины на территории Беларуси.

The article considers some of the categories of the Tatar immigrants who arrived in the Grand duchy of Lithuania in the end of the XV th – beginning of the XVI th centuries. It concludes about a package of reasons for tatars seeking sanctuary in the land of the grand dux, which were conductive to the intensification of the process of tatar community formation on the Belarusian territory.

Ад часоў кіравання вялікага князя Вітаўта-Аляксандра (1392–1430) на землях Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ) ішоў працэс стварэння этнічнай меншасці «літоўскіх» ці «беларускіх» татар. Падчас праўлення вялікіх князёў Свідрыгайлы (1430–1439)[1], Жыгімонта (1432–1440) і вялікага князя літоўскага, а з 1447 г. і польскага караля Казіміра Ягелончыка (1440–1492) стабільныя саюзніцкія адносіны з Крымскім ханствам і Вялікай Ардой спрыялі няспешнаму фарміраванню татарскай супольнасці. Аднак некаторыя падзеі апошняй чвэрці XV ст. змянілі сітуацыю. Унутрыдынастычная барацьба ў Крымскім ханстве ў 70-я гг. XV ст., ускладненая з 1475 г. прысутнасцю Асманскай імперыі на паўвыспе, прымусіла некаторых прадстаўнікоў з дынастыі Гірэяў шукаць прытулку ў ВКЛ. Няўпэўненасць у былых саюзніках вымагала ад дыпламатыі вялікіх князёў літоўскіх прымаць адпаведныя меры – так у двухбаковых крымска-літоўскіх адносінах з'явіўся інстытут заложнікаў. Татарскія набегі на паўднёвыя землі ВКЛ і Польскага каралеўства, а таксама памежныя войны з Вялікім княствам Маскоўскім прывялі да таго, што ў гарадах і замках утрымлівалі татар-палонных. Цягнуліся ланцугі бежанцаў, якія шукалі прыстанку ад ясачнай павіннасці, ханскага гневу або голаду. Вялікім гэты рух быў на самым пачатку XVI ст. пасля разгрому Вялікай Арды ў 1502 г.

Мэтай артыкула з'яўляецца вывучэнне асаблівасцей статусу некалькіх катэгорый татар, якія па розных прычынах былі вымушаны шукаць прытулку ў ВКЛ у канцы XV – першай трэці XVI ст., а таксама іх ролі ў фарміраванні сістэмы міжнародных адносін у акрэслены перыяд. Мы не будзем спецыяльна закранаць тых прадстаўнікоў татарскага насельніцтва, якія відавочна не з'яўляліся імігрантамі ў першым пакаленні.

Фарміраванне татарскай супольнасці ў ВКЛ у канцы XV – першай палове XVI ст. ішло некалькімі кірункамі. Аналіз заканадаўчых крыніц другой паловы XVI ст. дазваляе вылучыць дзве асобныя групы татарскага насельніцтва, якія адрозніваліся ў сваім сацыяльна-прававым статусе. У першую ўвайшоў набілітэт – прадстаўнікі дынастыі Чынгізідаў, князі, мурзы і ўланы. Ім былі дадзены многія правы шляхецкага саслоўя: валоданне зямлёй, служба ў войску і г. д., за выключэннем права валодаць хрысціянамі. Яны хутка інтэграваліся ў грамадскую сістэму ВКЛ і амаль змяшаліся з ёй. У другую групу ўвайшлі татары, якія не атрымалі шляхецкай годнасці. Яны ў асноўным кампактна сяліліся ў гарадах і мястэчках ВКЛ. Артыкул 76 чацвёртай часткі Статута 1588 г. вызначае адным з заняткаў татар ваенную службу і спецыяльна выдзяляе гэтую групу сярод усіх астатніх. Артыкул 10 дванаццатай часткі названага дакумента дакладна акрэслівае, «каторыя мурзы, князі, татары закона бусурманскага маюць аселасць, маёнткі земскія з наданнямі продкаў нашых і нас саміх і калі яны бываюць на службах нашых гаспадарскіх і земскіх у ротах... А каторыя татары ізвозам займаюцца, агароды трымаюць, скацінай гандлююць, скуры вырабляюць і якімсці рамяством на жыццё сабе зарабляюць...»[2].

На аснове гэтых крыніц і запісаў у кнігах Метрыкі ВКЛ яшчэ ў XIX – пачатку XX ст. была рас-

працавана іерархія татарскай супольнасці ў ВКЛ, якую экстрапаліравалі і на больш ранні перыяд[3]. Гісторык А. Мухлінскі ў сваёй працы пра татар ВКЛ, напісанай у сярэдзіне XIX ст., прапанаваў чатырохузроўневую структуру татарскага грамадства: тытулаваныя (князі, уланы, мурзы, якія маглі займаць пасады маршалкаў або харунжых татарскіх); простыя (мелі правы свабодных людзей, але не мелі зямлі); татары-казакі (забяспечвалі дастаўку перапіскі вялікага князя); гарадскія татары[4]. Недасканаласць прапанаванай стратавай сістэмы, якая цалкам задавальняла патрэбы гістарычнай навукі паўтара стагоддзі таму, сёння відавочна. Па-першае, яна не мае дакладнай хinduction храналагічнай прывязкі да канкрэтнага перыяду, а апісвае вялікі прамежак часу (XV – пачатак XVII ст.). Па-другое, у ёй спалучаюцца катэгорыі, запазычаныя з розных тыпалогій сацыяльнай структуры грамадства: тытулаваныя і простыя адпавядаюць юрыдычна-прававому прынцыпу групавання, татары-казакі – прафесійнаму (таксама з'яўляліся тытулаванымі і суадносіліся з дробнай шляхтай), гарадскія татары тое самае, што і простыя. Некаторыя даследчыкі вылучаюць асобныя групы татарскага насельніцтва на землях ВКЛ у залежнасці ад паходжання і сацыяльных функцый: князі, гаспадарскія татары, татары-казакі[5]. Аднак трэба зазначыць, што такіх катэгорый у дакументах сустракаецца значна больш. Спробу сістэматызаваць і падсумаваць назапашаны матэрыял па праблеме структуры татарскай супольнасці ў ВКЛ зрабіла ў дысертацыйнай працы З.І. Канапацкая[6], якая на падставе шырокага кола крыніц вылучыла катэгорыі і групы ў адпаведнасці з тыпалагічным прынцыпам. Але сацыяльная дынаміка не была прадметам яе даследавання, таму засталося шмат пытанняў вакол узнікнення той ці іншай групы і вылучэння асобных этапаў фарміравання татарскай этнарэлігійнай меншасці ў ВКЛ у канцы XIV – першай палове XVI ст.

У канцы XV і ў пачатку XVI ст. склалася своеасаблівая сітуацыя. На тэрыторыі ВКЛ ужо пражывала стабільная этнаканфесійная меншасць татар, у асноўным яна складалася з патомкаў перамешчаных за часы вялікага князя Вітаўта залатаардынскіх воінаў. Тыя, хто да гэтага часу ўкараніўся на літоўскіх і беларускіх землях, эфектыўна дзейнічалі ў межах заканадаўства пачатку XV ст. велікакняжацкіх прывілей. Аднак гэтага было недастаткова, каб будаваць адносіны ва ўмовах новай хвалі міграцыі. Маса татарскага насельніцтва не была адзіным стабільным арганізмам – людзі прыязджалі і ад'язджалі. Нельга дакладна высветліць, колькі з тых, хто апынуўся ў ВКЛ, стала аселі на гэтых землях. Да таго ж няма падставы меркаваць, што для ўраднікаў існавала прынцыповая розніца паміж татарскім набілітэтам і простымі татарамі, магчыма, толькі за выключэннем саміх Чынгізідаў – родзічаў ханаў. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што большасць татар па прыездзе на землі вялікага князя літоўскага цярпелі нястачу. Па-другое, функцыі ўсіх татар у дзяржаве зводзіліся кіруючым апаратам да вайсковай службы, але існавалі розныя адаптацыйныя механізмы, якія забяспечвалі татарам інтэграцыю ў саслоўную грамадскую структуру ВКЛ. Напрыклад, у Метрыцы сустракаецца дакумент, у якім адзін татарын скардзіцца, што служыць вялікаму князю, але зямель за гэта не мае. На першы погляд цалкам натуральны для літоўскага грамадства падыход: набілітэт служыў з зямлі, якую атрымліваў ад манарха. Але далей гэты чалавек просіць, каб яму дазволілі служыць за падатковыя ільготы на гандаль[7]. Зразумела, што звычайны статус не дазваляў шляхце асабіста займацца гандлем. У дадзеным выпадку мы сустракаемся са спробай прыстасаваць нормы шляхецкага стану да традыцый татарскага ладу жыцця. Былі і іншыя адносіны да татар, якія неслі вайсковую службу. У 1503 г. татары горада Гародня скардзіліся вялікаму князю, што намеснік гарадзенскі ўводзіць для іх новыя павіннасці. Гэта адразу паказвае на непрывілеяваны статус людзей, з якіх складалася татарская супольнасць у горадзе. Аднак у сваім прывілеі вялікі князь Жыгімонт Старога піша, што яны нясуць варту на нямецкай мяжы[8]. Зноў парадокс – статус набліжаны да катэгорыі баяр «путных», гэта значыць асабіста-вольных людзей, што нясуць пэўныя павіннасці перад дзяржавай, а абавязкі, якія на іх ускладзены, – шляхецкія. Варыятыўнасць падыходаў да прыстасавання татар у інакультурным асяроддзі залежала ад мноства сацыяльных, палітычных, эканамічных фактараў і ад асабістых якасцей эмігранта. З гэтай прычыны неабгрунтавана будаваць структуру татарскай супольнасці з дакладна акрэсленымі сувязямі і функцыямі ўнутры грамадства ВКЛ канца XV – першай паловы XVI ст., маючы пры гэтым на ўвазе ўсіх татар, што ў пэўны момант знаходзіліся ў межах дзяржавы.

Няўстойлівае ўнутранае становішча наваўтвораных татарскіх дзяржаў, у першую чаргу Крымскага ханства і Вялікай Арды, прывяло да сітуацыі, калі многія прадстаўнікі правячых дынастый былі вымушаны шукаць прытулку ў саюзных ім дзяржавах Усходняй Еўропы. Такая практыка ўсталявалася яшчэ ў часы кіравання вялікага князя Вітаўта, і праз сорак гадоў пасля яго смерці на тэрыторыі ВКЛ зноў апынуліся непасляховыя прэтэндэнты на ўладу ў Крымскім ханстве. Пасля смерці хана Хаджы-Гірэя яго нашчадкам стаў старэйшы сын Нур-Даўлет пры падтрымцы брата Айдара. Яны прынеслі прысягу Казіміру Ягелончыку, але неўзабаве адбыўся пераварот і ўладу захапіў іх брат Менглі-Гірэй. Былыя ўладары падаліся да вялікага князя літоўскага, каб уратавацца ад смерці. Спасылаючыся на старадаўнюю традыцыю, Казімір Ягелончык, вялікі князь літоўскі, апавядаў хану Менглі-Гірэю пра становішча

бежанцаў у Княстве так: «…і он (Нур-Даўлет. – *А. Л.*) в тую свою прыгоду прыехаў к нам... з братом своім Аідаром, і мы ім хлеба нашого і солі жалваня неборонілі, какжо здавна бывало за предков нашых, а потом і за нас, которы колі цар, албо князі і вланове в прыгоду свою прыежджывалі... тут ім в нашої землі опочынок быў, а предкове нашы і мы хлеба і солі і жалованя не боронівалі ім до часу, покул дело свое оправят...»[9] Такім чынам, можна зрабіць выснову, што найпершай прычынай разрыву паміж ВКЛ і Крымскім ханствам стала не вялікаардынскае пытанне, бо Менглі-Гірэй нават не паспеў цвёрда ўмацавацца на бацькавым месцы, і не маскоўская палітыка, бо першы дыпламатычны захад Вялікага княства Маскоўскага ў гэтым кірунку адбыўся ў 1474 г., а знаходжанне на княжацкіх землях прэтэндэнтаў на ўладу. Існавала патэнцыйная магчымасць скарыстаць Нур-Даўлета і Айдара, каб паўплываць на размеркаванне ўлады ў Крымскім ханстве. Гэта пацвярджае ліст Менглі-Гірэя да вялікага князя Івана Васільевіча з просьбай пільна сачыць за яго сваякамі, якія пераехалі на службу да маскоўскага князя.

Дарэчы, вольны ад'езд і прыезд высокапастаўленых бежанцаў быў адной з галоўных умоў іх прабывання на землях ВКЛ. Найбольш яскрава гэта праявілася падчас выезду тых жа Нур-Даўлета і Айдара ў Маскву. З запісаў Метрыкі пра пасольства ў Крымскае ханства, якія датуюцца 22 жніўня 1486 г., вядома, што ад'езд братоў Менглі-Гірэя адбыўся па «намавенні» нейкіх людзей: «…нехотелі в нашой землі мешкаті, і поехаті там, где тепер жывут...»[10] Не зважаючы на магчымую карысць ад прысутнасці законных прэтэндэнтаў на ўладу ў Крымскім ханстве, нішто ў гэтым запісе не сведчыць пра спробу іх прымусовага затрымання ў межах зямель, падуладных вялікаму князю літоўскаму. Належныя ўмовы для бежанцаў, якія былі створаны для тытулаваных татар у часы Казіміра Ягелончыка, утрыманне іх «во чті і в жаловані», свабода ў выбары свайго далейшага лёсу схілілі самога Менглі-Гірэя заручыцца падтрымкай вялікага князя літоўскага на выпадак пазбаўлення ўлады.

Аднак не толькі ўладары і радавітыя татары шукалі прытулку ў ВКЛ. Пасля пакут і канчатковага разгрому ў 1502 г. Заволжская Арда рассеялася па прасторах Усходняй Еўропы. Частка з падданых апошняга цара Шых-Ахмата, пачынаючы ад самага пачатку XVI ст., паступова аселі ў Крымскім ханстве, а некаторыя прыехалі на землі вялікага князя літоўскага. Разам з братам схаваўся тут і сам цар Шых-Ахмат, але іх становішча хутчэй можна акрэсліць як статус ганаровых палонных. Большасць татар аселі тут на іншых умовах. Каб засцерагчыся ад нечаканай пагрозы з боку зноў прыбыўшых татар, іх раздавалі на парукі часам родзічам, а часам проста тым татарам, хто гарантаваў бяспечныя паводзіны суайчыннікаў. У Метрыцы ўтрымліваецца пералік заволжскіх татар, якія былі раздадзены на парукі ў 1502 г.[11] У сувязі з тым, што дакумент быў надрукаваны толькі часткова, немагчыма правесці поўны яго аналіз. Але нават з гэтай інфармацыі бачна, што справа тычылася найбліжэйшага акружэння хана – уланаў і каморнікаў. Іх бралі на парукі пад заклад грошаў. Найбольшая сума давалася за пляменніка князя Ахмета Улановіча ўлана Ноўгарадскага, Ікібяка ўлана і яго служку – трыста коп грошаў. Пералічваецца прыблізна каля дванаццаці татар, адказнасць за якіх была ўскладзена на іх супляменнікаў, на тых, якія ўжо паспелі знайсці сваё месца ў сацыяльнай лесвіцы ВКЛ і нават стаць ураднікамі. Відавочна, што трапіўшыя на літоўскія землі падчас нягод 1502 г. былі больш абмежаваны ў магчымасцях за прэтэндэнтаў на ўладу тых жа Нур-Даўлета і Айдара. Звычайна выдача на парукі была мерай паляпшэння становішча палонных, напрыклад, вялікі князь літоўскі прасіў маскоўскага пасла Якава ўзяць на парукі літоўскіх палонных[12].

У гістарычных крыніцах сустракаюцца звесткі пра знаходжанне асабліва блізкіх родзічаў крымскага хана і татарскіх прадстаўнікоў правячых колаў на землях ВКЛ у становішчы, якое не можа разглядацца як прадстаўленне прытулку. Гэтыя людзі з'яўляліся гарантыйным забеспячэннем знешнепалітычных абавязкаў – заложнікамі. Найчасцей такую ролю выконвалі сыны хана, самай высокай ступенню даверу, відавочна, лічыўся прыезд старэйшага з іх. Высылка ў якасці заложнікаў ханскіх дзяцей даволі распаўсюджаная ўмова «докончаній» з ВКЛ. Напрыклад, яна сустракаецца ў запісах Метрыкі пра пасольства Яна Давойнавіча і Якуба Даматкана 1486 г.: «...а сына своего первородного нам дасі, как жо есі і первеі того к нам о том неоднокрот всказывал...» Двума гадамі раней адной з умоў міру паміж Казімірам Ягелончыкам і Менглі-Гірэем была тая ж выдача ханскага сына ў якасці заложніка[13]. Для Крымскага ханства заложніцтва не з'яўлялася на той момант новай дыпламатычнай практыкай. Асманская імперыя шырока выкарыстоўвала яго ў адносінах да залежных краін Усходняй Еўропы – Крымскага ханства і Малдаўскага княства. Можна меркаваць, што калі сыны Менглі-Гірэя і прыязджалі да вялікага князя літоўскага, то з пэўным акружэннем, колькасць і намеры якога прадказаць было немагчыма. Напрыклад, Жыгімонт Стары піша да малдаўскага ваяводы ў лісце ад 5 кастрычніка 1511 г., што Менглі-Гірэй адпусціў сына і ўнука ў «заклад» і паслаў з імі 5 тысяч войска, але яны разам з войскам, якое суправаджала іх да мяжы, раптоўна павярнулі ў бок Малдаўскага княства[14]. У гэтым выпадку нават сам кароль не ведаў дакладных намераў царэвічаў.

Заложнікі выкарыстоўваліся не толькі ў якасці гарантыі выканання ўмоў вялікіх міждзяржаўных дамоўленасцей. Пасольства да татар было справай небяспечнай. Вядомы выпадкі, калі паслы, адпраўленыя ў Крым, утрымліваліся там як па-

лонныя і цярпелі пакуты. Напрыклад, пан Пётр Пашковіч, маршалак, які ўваходзіў у склад гаспадарскай рады, памёр падчас сваёй місіі, што Казімір Ягелончык і паставіў у віну Менглі-Гірэю. Малдаўскі ваявода пісаў у 1512 г. вялікаму князю і каралю Жыгімонту Старому з данясенняў сваіх паслоў у Крыме, што паслы ВКЛ утрымліваюцца ў Крыме вельмі дрэнна[15]. Таму, каб засцерагчыся ад небяспекі з гэтага боку, вялікі князь у некаторых выпадках патрабаваў ад хана прысляць яму людзей у заклад, роўных па пасадзе і сацыяльным статусе з тымі пасламі, што ехалі да Перакопскай Арды. Гэтая ўмова абмяркоўвалася падчас пасольства вялікага князя літоўскага Мішкам Свірынічам да Менглі-Гірэя ў 1486 г.: «…есі ты брат наш прыслал к нам которого своего человека доброго, таковож ровного нашому послу в закладе, нехаібы он в нас тут замешкал, абы наш посол веліki от тебе к нам добровольно вернулся... а мы того твоего чоловека хочом меті в доброй почтівості... а мы твоего чоловека почтіво отпустіті до тебе хочом»[16].

На жаль, крыніцы мала што захавалі для нас пра ўмовы ўтрымання заложнікаў падчас знаходжання гэтых асоб у ВКЛ. У крыніцах выкарыстоўваецца агульная форма «держаті во чті і в ласце»[17]. Акрамя гэтага, вядома, што ўтрыманне тытулаваных татар як сродак замацавання саюзніцкіх адносін адначасова з'яўлялася і фінансавай данінай з боку ВКЛ разам з падарункамі і «памінкамі», бо сродкі на ўтрыманне татар ішлі з дзяржаўнага скарбу. Кіеўскі ваявода спецыяльна для гэтага атрымліваў вызначаную суму грошаў, а калі гэтага не хапала, дадаваў са сваіх даходаў, потым расходы кампенсаваліся за кошт дзяржавы[18].

Праблема звароту палонных вельмі востра стаяла ва ўзаемаадносінах ВКЛ з усімі тымі дзяржавамі, з якімі яно вяло войны ці зацяжныя памежныя канфлікты, у тым ліку і з Крымскім ханствам. Спецыфіка татарска-літоўскіх стасункаў па пытанні палону зводзілася да масавага вываду мірнага насельніцтва з паўднёвых тэрыторый падчас рабаўнічых наездаў перакопскіх ардынцаў. Фактычна страчаных вярнуць не было магчымасці, бо продаж вязняў быў адной з галоўных крыніц даходу Крымскага ханства і таму дыпламатычныя сродкі давалі мала карысці. Вельмі паказальна ў гэтым плане тлумачэнне Менглі-Гірэя, чаму немагчыма вярнуць нарабаванае пасля наезду зімой 1483–1484 гг.: «...іно как мога отвернул был, по первым веременем волі нашее нет, как до мест доыдет розпродадут... што колі нашло ся... от себе есмі окупіл к своему брату королю, к велікому королевству послалі есмо...»[19] Таму палонных татар па магчымасці абменьвалі на трапіўшых у няволю падданых ВКЛ. Знаёмства татарскага палоннага з жыццём жыхароў Княства, іх звычаямі і традыцыямі пачыналася падчас этапа да месца сталага ўтрымання.

З канца XV ст. ураднікамі ВКЛ распачынаецца ажыццяўленне планамернай палітыкі асаджэння палонных татар на сваёй тэрыторыі. Вымыванне насельніцтва з паўднёвых зямель дзяржавы было настолькі вялікім, што ўжо нельга было арганізаваць эфектыўную абарону сваіх межаў на гэтым кірунку. Каб неяк кампенсаваць памяншэнне працоўных рук, і сталі асаджаць на беларускіх і ўкраінскіх землях палонных крымчакоў.

Найвялікшае адлюстраванне ў літаратуры атрымалі дзве акцыі. Першая звязана з паражэннем крымскага войска ў Клецкай бітве 1506 г., пасля якой палонныя татары аселі ў Клецку і Мінску, зруйнаваным пасля набегу 1505 г.[20] Другая – з Валынскай кампаніяй Канстанціна Астрожскага 1508 г., які асадзіў татарскі палон у Астрогу, на «Падлессе» і левым узбярэжжы Буга[21]. Пра планамернасць мерапрыемстваў па асаджэнні палонных татар і талерантныя адносіны да іх сведчыць унікальная крыніца, якая была створана ананімным аўтарам татарскага паходжання ў сярэдзіне XVI ст., «Трактат пра польскіх татараў». У ім сітуацыя апісваецца наступным чынам: «У новыя часы палонныя, узятыя на вайне, не трактуюцца ў месцах кампактнага пражывання татар як чужаземныя нявольнікі, якіх прадаюць па вялікім кошце або ўтрымліваюць у аковах, выкарыстоўваюць на розных цяжкіх працах. Іх адсылаюць у нашыя асады, дзе яны пасяляюцца і атрымліваюць ад братоў сваіх дапамогу, у тым ліку і харчаванне. Яны пачынаюць займацца промысламі, якія сабе абяруць, або рамяством, якім валодалі»[22]. У цытаваным тэксце падкрэслены дзве асаблівасці, што былі характэрны для жыцця катэгорыі асаджаных татарскіх палонных. Першая – гаспадарча-арыентаваная палітыка, скіраваная на выкарыстанне рамесна-вытворчага патэнцыялу палонных. Гэта значыць, што асноўная маса татар, якіх сялілі ў «асадах», не была прыраўнавана да шляхецкага стану, і асноўным механізмам канверсійнай адаптацыі было выкарыстанне іх у рамеснай вытворчасці. З другога боку, адчуваецца моцны ўплыў супольнасці, якая ўжо да гэтага часу сфарміравалася з нашчадкаў імігрантаў у другім і трэцім пакаленнях. Відавочна, што адной з галоўных каштоўнасцей татарскай супольнасці ў іначэтнічным славяна-балцкім акружэнні была прыналежнасць да татарскага народа. Гэта пацвярджаецца і звесткамі пра падтрымку татарамі-гараджанамі новых палонных суайчыннікаў у «Трактаце пра польскіх татараў», і выкупам на парукі набілітэтам вялікаардынскіх бежанцаў у 1502 г.

Такім чынам, прычыны і шляхі, па якіх татары аказваліся ў межах ВКЛ, былі самымі рознымі. Аднак кожная катэгорыя імігрантаў займала пэўнае месца ў знешняй палітыцы дзяржавы. Трэба яшчэ раз падкрэсліць, што сярод усіх імігрантаў асабліва вылучаюцца прадстаўнікі дынастыі Чынгізідаў, блізкая, кроўная радня хана. Яны былі моцным інструментам уздзеяння на ўнутрыпалітычную барацьбу і знешнюю палітыку татарскіх краін. Утрыманне бежанцаў-царэвічаў, а таксама

царэвічаў-заложнікаў, хаця апошнія і не былі імігрантамі ў поўным сэнсе, магло забяспечыць спакой на паўднёвых межах як Польскага каралеўства, так і ВКЛ. Радавітыя і простыя татары, якія па розных прычынах аказваліся на землях вялікага князя, служылі ў войску, ахоўвалі практычна ўсе дзяржаўныя межы ад «немцаў» на поўначы і да татарскіх рубяжоў на поўдні. Частка імігрантаў у войску ВКЛ маглі складаць значна больш за палову. Татарскія палонныя выкарыстоўваліся для абмену на літоўскіх і для папаўнення ў стратах насельніцтва ў выніку памежных войн з Вялікім княствам Маскоўскім і тых жа татарскіх набегаў. Звычайна ўплыў татар на сістэму міжнародных адносін у гістарычнай літаратуры абмяжоўваўся непасрэдна палітыкай асобных дзяржаў. Але вывучэнне прычын і шляхоў міграцыі, а таксама спецыфіка іх становішча па-за ардой паглыбляюць разуменне месца і ролі татарскага фактару ў адносінах краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

[1] Гл.: Любы А.Ул. Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім княстве Літоўскім у 30–40-я гг. XV ст.: Аўтарэф. дыс. … канд. гіст. навук. Мн., 2006. С. 6.

[2] Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мн., 1989. С. 197, 316.

[3] Гл.: Мухлинский А. Изследование о происхожденіи и состояніи литовскихъ татаръ. Мн., 1993. С. 21–27; Гембіцкі Я. Да пытаньня аб соцыяльно-экономічным стане беларускіх татар у сярэднявечча // Зап. аддзелу гуманітар. навук. 1928. Кн. 8. С. 53–69.

[4] Гл.: Гембіцкі Я. Указ. тв. С. 23–26.

[5] Гл.: Гришин Я.Я. Польско-литовские татары: взгляд через века. Казань, 2000. С. 10.

[6] Гл.: Канапацкая З.И. Татары Беларуси и их культура: Автореф. канд. … ист. наук. Мн., 2005. С. 13–14.

[7] Гл.: Lietuvos Metrika. Kn. 8 (1499–1514). Vilnius, 1995. P. 200.

[8] Гл.: Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546). Vilnius, 1998. P. 17.

[9] Pułaski K. Stosunki z Mendli-Girejem chanem tatarów perekopskich (1469–1515). Akta i listy. Kraków; Warszawa, 1881. S. 217.

[10] Ibid. S. 217.

[11] Ibid. S. 266.

[12] Гл.: Памятники истории Восточной Европы. Источники XV–XVII вв. Том второй: Выписка из посольских книг. М.; Варшава, 1997. С. 82.

[13] Гл.: Pułaski K. Op. cit. S. 214–215, 217–219.

[14] Гл.: Sprawy woloski za Jagellonow / Pod red. A. Jablonowski. Warszawa, 1887. S. 110–111.

[15] Ibid. S. 112–113.

[16] Pułaski K. Op. cit. S. 216–217.

[17] Ibid. S. 208–209.

[18] Гл.: Lietuvos Metrika. Kn. 10 (1440–1523). Vilnius, 1997. P. 76–77.

[19] Pułaski K. Op. cit. S. 214–215.

[20] Гл.: Канапацкі І.Б., Смолік А.І. Гісторыя і культура беларускіх татар. Мн., 2000. С. 26.

[21] Гл.: Мухлинский А. Указ. тв. С. 18.

[22] Гришин Я.Я. Указ. тв. С. 10.

Паступіў у рэдакцыю 26.09.07.

***Алёна Аляксандраўна Любая*** – аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт А.В. Мартынюк.